адлюстраваліся лепшыя рысы беларускага народа: шчырасць, гасціннасць, добразычлівасць, працавітасць. Кожны беларус ганарыцца сваёй краінай, шануе багатую духоўную спадчыну свайго народа.

У сучасным свеце мы з належнай павагай ставімся да традыцый нашых продкаў, так як у кожнай традыцыі змяшчаецца жыццёвы вопыт, народная мудрасць і вядома ж выконваць гэтыя традыцыі – наш абавязак.

ЛІТАРАТУРА:

1. Беларускае свята – Купалле [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.rukodelie.by/content/?id=2236. – Дата доступу: 12.10.2016.
2. Радзіма мая – Беларусь // Купалле [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://galinaartemenko.livejournal.com/296801.html. – Дата доступу: 10.10.2016.
3. Купалле – свята вады і агню [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://news.21.by/society/2012/07/05/561468.html. – Дата доступу: 13.10.2016.

## ТЭМА ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў ТВОРАХ ПАЭТАЎ СЛОНІМШЧЫНЫ

УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
**Лапацей В.А., Данилюк В.В., студэнткі 1 курса лячэбнага факультэта**
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В.І.

Вывучаючы тэму "Беларуская літаратура ў гады Вялікай Айчыннай вайны", мы пазнаёміліся з творчасцю многіх беларускіх пісьменнікаў. Узнікла цікавасць, а хто з паэтаў Слонімшчыны быў удзельнікам гэтай вайны? Было вырашана правесці даследаванне ў гэтым накірунку.. Мы вылучылі такіх паэтаў: Сяргей Новік-Пяюн, Анатоль Іверс, Валянцін Таўлай, Алесь Сучок. Творчасць Алеся Сучка дакладна даследуюць яго родзічы. Мяркуем, што ваенная паэзія паэтаў Слонімшчыны ў большай ступені павінна быць прасякнута патрыятычным пафасам, адгукацца на падзеі тагачаснай рэчаіснасці.

Мэта працы: выявіць спецыфіку матываў і вобразаў і іх значэнне ў вершах, напісаных у гады вайны ў паэтаў Слонімшчыны.

Любы літаратурны твор – завершаны па форме празаічны ці паэтычны тэкст. У літаратуры паняцце «вобраз» мае некалькі значэнняў. У лірыцы перш за ўсё выяўляюцца т. зв. слоўныя вобразы, або тропы, вобраз-малюнак (партрэтная, пейзажная замалёўка, апісанне падзей і г. д.), вобраз-перажыванне, вобразы-сімвалы, Для лірыкі ў цэлым характэрны вобраз лірычнага героя.

Лірыка С. Новіка-Пеюна перыяду Вялікай Айчыннай вайны – з'ява адметная, арыгінальная: няма ў ёй байцоў-франтавікоў, асілкаў-партызанаў, герояў са зброяй у руках, але ёсць нешта большае, што адчуваецца на ўзроўні сэрца: мужнасць і непахіснасць «змагароў без зброі». Якія ж матывы ў іх гучаць?

Репозиторий ГрГМУ

Невыпадкова адзін з асноўных матываў - гэта матыў паказу жыцця вязня ў канцлагеры. Да матываў пакуты і нянавісці далучаецца матыў надзеі і веры ў перамогу.

Сузіранне родных краявідаў падтрымлівае ў ліхую часіну сваіх дзяцей, таму можна далей гаварыць пра матыў любові да прыроды. Кожны пейзажны верш – гэта маленькі шэдэўр, таму што нічога падобнага да пейзажных вершаў С.Новіка-Пеюна не было створана. Верш «Восень залатая», так добра вядомы многім беларусам, напісаны С.Новікам-Пеюном у чаканні расстрэлу ў камеры адзіночцы. Строфы настолькі лёгкія, здаецца ўсё ў іх напоўнена жыццёвай сілай: «Ніткай срэбнай павуцінне// У косах сонейка блішчыць// Што за цуднае зіхценне!// Што за ціш вакол стаіць!».Гэтыя ж матывы можна бачыць і ў вершы «Над Шчарай».Гэты верш пакладзены на музыку

Нельга абмінуць матывы кахання, што прысутнічаюць у многіх творах С.Новіка-Пеюна. Апаэтызаваны інтымныя пачуцці ў вершах «Калі гляджу на неба сінь…», «Я так цябе люблю», «Белы снег», «Я вазьму цябе за рукі». Вядома, што прысвечаныя яны не жонцы, а Лялі Стры-й, якую фашысты расстралялі ў 1944 годзе.

Наступны раздзел працы прысвечаны Валянціну Таўлаю. Паэт гады акупацыі правёў на Навагрудчыне. Яго жыццё ў гэты перыяд было поўнае трагізму: быў ён і ў нямецка-фашысцкай турме, у Асвенціме загінулі сваякі і бацька Таўлая, страціў у той час дачушку-немаўля. Чым жа адметная паэзія падпольшчыка і партызана?

Адразу акцэнтуем ўвагу на вершах з сатырычнымі матывамі «Кветкалюбы», «Новая Еўропа», «Гадавіннасць», «Яго, бандыта, на прыцэл вазьмі!». Усе іх аб’ядноўвае наяўнасць матыву моцнай нянавісці да фашыстаў.

Матывы бяды, народнага гора гучаць у творы «Новая Еўропа».

Матыў смерці, матыў магілы прысутнічае ў лістах з турмы, таму што паэт чакае прысуду, разумее, што «дажывае восеньскія дні

У мастацкім свеце паэзіі В.Таўлая выразна прасочваецца матыў шляху. Звычайна, шлях – гэта ўсведамленне руху, вандроўкі. У вершах В.Таўлая вандроўнік незвычайны – вайна: «Вайна рынула шляхамі ў Беларусь», над шляхамі з’яўляецца начальнік – «начальнік усіх шляхоў з напрамкам на Берлін». З’яўляецца «шлях да пушчаў і сёлаў» – гэта такая неабходная для таго часу сувязь партызанаў і мірнага насельніцтва. Партызанскія шляхі характэрны для Беларусі: «Пажараў полымя наш гнеў вялікі грэла, “І шлях асвечвала ў адвечныя бары». У другім вершы шлях – гэта сцежка, сувязь з родным домам, аўтар свядома ўжывае ў гэтым значэнні эпітэт «сцежкі розныя».

Чацверты раздзел – гэта паэзія Анатоля Іверса. Вершы паэта, напісаныя ў гады Вялікай Айчыннай вайны, знайшлі месца ў зборніку «Я пайшоў бы ўслед за летам», выдадзеным у 1987 годзе, а таксама ў кнізе вершаў і ўспамінаў «Аўсяныя росы» 2011 года выдання. Ганенні з боку улады адчуваў на сабе падпольшчык доўгі час.

У вершах гэтага перыяду можна бачыць той самы матыў хаты**,** што ёсць і ў С.Новіка-Пеюна, і ў В.Таўлая, толькі гэта патрызанскі лагер.



Рэпазіторый ГрГМУ